ПАСТАНОВА МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
7 ліпеня 2023 г. № 191

# Аб вывучэнні моў асобнымі катэгорыямі асоб з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця

На падставе пунктаў 3 і 5 артыкула 82 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб адукацыі Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ПАСТАНАЎЛЯЕ:

1. Устанавіць, што:

1.1. для навучэнцаў з парушэннем слыху, якія не чуюць або слаба чуюць са стратай слыху ў межах 70–90 дэцыбелаў (далей – навучэнцы з парушэннем слыху), для навучэнцаў з цяжкімі парушэннямі маўлення пры атрыманні спецыяльнай адукацыі на ўзроўні агульнай сярэдняй адукацыі вывучэнне беларускай або рускай моў, адной з замежных моў не з'яўляецца абавязковым;

1.2. адукацыйны працэс пры атрыманні спецыяльнай адукацыі на ўзроўні агульнай сярэдняй адукацыі навучэнцамі з парушэннем слыху ў спецыяльных школах, спецыяльных школах-інтэрнатах, установах агульнай сярэдняй адукацыі, іншых установах адукацыі пры рэалізацыі адукацыйнай праграмы спецыяльнай адукацыі на ўзроўні агульнай сярэдняй адукацыі (далей, калі не ўстаноўлена іншае, – установа адукацыі) арганізуецца:

ва ўстановах адукацыі з беларускай мовай навучання – на беларускай (пісьмовая, вусная, дактыльная формы) мове і на жэставай мове;

ва ўстановах адукацыі з рускай мовай навучання – на рускай (пісьмовая, вусная, дактыльная формы) мове і на жэставай мове;

1.3. адукацыйны працэс пры атрыманні спецыяльнай адукацыі на ўзроўні агульнай сярэдняй адукацыі навучэнцамі з цяжкімі парушэннямі маўлення арганізуецца:

ва ўстановах адукацыі з беларускай мовай навучання – на беларускай мове;

ва ўстановах адукацыі з рускай мовай навучання – на рускай мове;

1.4. вывучэнне беларускай або рускай мовы пры атрыманні спецыяльнай адукацыі на ўзроўні агульнай сярэдняй адукацыі навучэнцамі з парушэннем слыху, навучэнцамі з цяжкімі парушэннямі маўлення ажыццяўляецца ў адпаведнасці з вучэбным планам другога аддзялення спецыяльнай школы, спецыяльнай школы-інтэрната для вучняў з парушэннем слыху і вучэбным планам спецыяльнай школы, спецыяльнай школы-інтэрната для вучняў з цяжкімі парушэннямі маўлення;

1.5. вывучэнне адной з замежных моў на базавым і павышаным узроўні пры атрыманні спецыяльнай адукацыі на ўзроўні агульнай сярэдняй адукацыі навучэнцамі з парушэннем слыху і навучэнцамі з цяжкімі парушэннямі маўлення ажыццяўляецца па іх жаданні, жаданні законнага прадстаўніка непаўналетняга навучэнца за кошт вучэбных гадзін, якія вызначаны адпаведнымі вучэбнымі планамі спецыяльных школ, спецыяльных школ-інтэрнатаў на правядзенне факультатыўных заняткаў;

1.6. для навучэнцаў з парушэннем слыху, навучэнцаў з цяжкімі парушэннямі маўлення, навучэнцаў, якія маюць парушэнні маўлення і навучаліся па вучэбным плане спецыяльнай школы, спецыяльнай школы-інтэрната для вучняў з цяжкімі парушэннямі маўлення пры атрыманні прафесіянальна-тэхнічнай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі з адначасовым атрыманнем агульнай сярэдняй адукацыі не з'яўляецца абавязковым:

вывучэнне беларускай мовы ў выпадку, калі яны навучаліся ва ўстановах адукацыі з рускай мовай навучання;

вывучэнне рускай мовы ў выпадку, калі яны навучаліся ва ўстановах адукацыі з беларускай мовай навучання;

вывучэнне адной з замежных моў;

1.7. пры атрыманні прафесіянальна-тэхнічнай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі з адначасовым атрыманнем агульнай сярэдняй адукацыі навучэнцамі, якія азначаны ў падпункце 1.6 дадзенага пункта, вывучэнне адной з замежных моў ажыццяўляецца па іх жаданні, жаданні законнага прадстаўніка непаўналетняга навучэнца;

1.8. для навучэнцаў з парушэннем слыху, навучэнцаў з цяжкімі парушэннямі маўлення, навучэнцаў, якія маюць парушэнні маўлення і навучаліся па вучэбным плане спецыяльнай школы, спецыяльнай школы-інтэрната для вучняў з цяжкімі парушэннямі маўлення пры атрыманні прафесіянальна-тэхнічнай, сярэдняй спецыяльнай, агульнай вышэйшай і спецыяльнай вышэйшай адукацыі вывучэнне беларускай мовы не з’яўляецца абавязковым у выпадку, калі яны навучаліся ва ўстановах адукацыі з рускай мовай навучання.

2. Прызнаць страціўшай сілу пастанову Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 13 ліпеня 2011 г. № 69 «Аб некаторых пытаннях вывучэння моў асобнымі катэгорыямі асоб з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця».

3. Дадзеная пастанова ўступае ў сілу пасля яе афіцыйнага апублікавання.

**Міністр** **А.І.Іванец**

УЗГОДНЕНА
Брэсцкі абласны
выканаўчы камітэт

Віцебскі абласны
выканаўчы камітэт

Гомельскі абласны
выканаўчы камітэт

Гродзенскі абласны
выканаўчы камітэт

Мінскі абласны
выканаўчы камітэт

Магілёўскі абласны
выканаўчы камітэт

Мінскі гарадскі
выканаўчы камітэт